ших и старших курсов БГТУ. Цель – выяснить эффективность понимания ими учебного текста, с помощью анализа их ответов на вопросы. Эмпирические данные этого исследования необходимы для дальнейшей теоретической разработки поставленной проблемы.

Структура текста представляет собой единое целое. И хотя каждая из ее составляющих нацелена на выполнение своей задачи, все они находятся в тесной взаимосвязи. С учетом вышесказанного и проводилась разработка вопросов для анкет. Кратко остановимся на характеристике составляющих структуры учебного текста [3].

*Информационная составляющая* структуры текста учебника должна содержать учебную информацию в соответствии с его целевым и читательским назначением, четко соответствовать учебной программе и требованиям, предъявляемым к нему. Редактор, анализируя эту составляющую структуры текста, должен оценить необходимость, достаточность содержащихся в тексте сведений для достижения цели произведения.

*Логическая составляющая* структуры текста должна обеспечивать последовательное, непротиворечивое и целостное изложение материала. Редактор, основываясь на знании законов логики (тождества, достаточного основания и др.), общелогических методов познания (таких как: анализ, синтез, индукция, дедукция и др.), должен уметь оценить реализованы ли в тексте перечисленные требования к данной составляющей структуры текста.

Главная задача *психологической составляющей* структуры учебного текста – это управление процессом чтения студента, ходом читательской мысли. Редактор, анализируя, оценивая и помогая автору выстраивать текст, должен использовать способы и приемы изложения, которые помогут студенту легче и лучше понять и усвоить учебный текст (например, такие как: способ изложения от простого к сложному, прием активизация внимания с помощью диалогичности и скважистости текста и др.).

Задача *эстетической составляющей* структуры текста – обеспечивать эмоциональный настрой студента, способствовать лучшему пониманию и запоминанию им учебного текста. Редактор, рассматривая ее, прежде всего должен оценивать такие эстетические качества текста как: пропорциональность, конкретность, соразмерность и др.

Планируемые результаты исследования: выявление функций составляющих текста учебного издания и представление его структуры в виде целостной системы, максимально ориентированной на студента. Исследование должно способствовать дальнейшему развитию теории редактирования, повысить качество подготовки специалистов редакционно-издательского дела, и как закономерный результат – качество выпускаемой учебной книги, а, следовательно, и уровень подготовки будущих специалистов народного хозяйства нашей страны.

**Литература**

1. Редактирование отдельных видов литературы / Под ред. Н. М. Сикорского. – М.: Книга, 1987. – 400 с.
2. Ляхов В.Н. Очерки теории искусства книги. – М.: Книга, 1971. – 256 с.
3. Феллер М.Д. Структура произведения. – М.: Книга, 1981. – 272 с.
4. СТБ 7.60-93 «Выданні. Асноўныя віды». – Мн.: Белстандарт, 1993. – 28 с.

## ЭСКЕЙПІСЦКАЯ НАКІРАВАНАСЦЬ СУЧАСНАГА МАСТАЦКАГА МЫСЛЕННЯ

*А. М. Шылец*
Навуковы кіраўнік – д.філал.н., дацэнт ***Т. І. Шамякіна***
*Беларускі дзяржаўны універсітэт*

У аснове метадалогіі работы – ідэі беларускіх і замежных даследчыкаў, якія распрацоўвалі праблемы стасункаў літаратуры і міфалогіі, псіхалогіі творчасці, тэорыі сімвалу (К. Юнга, Э. Ноймана, М. Эліядэ, Ю. Лотмана, З. Мінц, С. Цялегіна, Т. Шамякінай і інш.). Мэта даследавання заключалася ў тым, каб прааналізаваць асаблівасці мастацкага мыслення ў кантэксце неаміфалагізму сучаснасці. XX-е стагоддзе прайшло пад знакам тэндэнцыі неаміфалагізму, аднаўлення міфалагічных мадэлей, структур, міфалагічнай свядомасці. Ранейшая карціна свету не магла больш задавальняць патрэбу чалавека ў арыенцірах. Сітуацыя

раздробленасці, раз'яднанасці свету і самога чалавека прывяла да таго, што ў новых культурных умовах актуалізавалася міфалагічная мадэль свету. Паводле даследчыка С. Цялегіна, прычынай інстынкту міфатворчасці з'яўляюцца комплексы непаўнавартаснасці, нявызначанасці чалавецтва, а таксама страх адзіноты перад таямніцамі Сусвету. У дэсакралізаваным свеце чалавек не мае апоры ўнутры сябе, унутры сваёй хаатычнай свядомасці, таму "сучасная міфатворчасць робіцца прадуктам дзейнасці асобы, якая імкнецца да адасаблення, але баіцца адзіноты" [2, *140*].

Чалавек жыве сярод створаных ім сэнсавобразаў. Характэрнай рысай міфа з'яўляецца недзяленне свету матэрыяльнага і ідэальнага. Паводле міфапаэтычных уяўленняў, усё рэчаіснае можа стаць ілюзорным, а ўсё ілюзорнае – рэчаісным. Глабальны недахоп духоўнасці, праяў вышэйшага сэнсу ў рэчаіснасці выклікае фрустрацыю, з якой бярэ пачатак інстынктыўнае імкненне схавацца ад непрыемнай рэальнасці. Для сучаснага грамадства характэрнай з'явай становіцца эскапізм (ад англ. *escape* – уцёкі) – уцёкі ад рэчаіснасці, выкліканыя цалкам зразумелым жаданнем пасяліцца ў свеце ўласных фантазій, летуценняў. Як сведчаць псіхолагі, сыход ва ўнутраны свет набывае масавы характар. Гэта можа быць станоўчай з'явай, калі чалавек канструктыўна падыходзіць да сваіх сэнсавобразаў. Звычайна творчыя людзі крэатыўна выкарыстоўваюць такія сыходы ў "іншую", прыдуманую рэальнасць. Крайняй праявай пабегу ад свету з'яўляецца зацыкленасць на асобасным міфе, якая назіраецца ў псіхічна хворых. Разглядаючы матывы пасвячэнн і літаратурныя тэмы, М. Эліядэ пісаў, што "кожнаму чалавеку хочацца сутыкнуцца з небяспекай, перажыць прыгоды ў "іншым свеце" – і ён спрабуе ўсё гэта на ўзроўні свайго прыдуманага, уяўнага жыцця" [3, *313*].

Сучаснае філасофскае мысленне адмаўляецца ад пастулата, згодна з якім існуе толькі адна рэальнасць. Філасофская думка прызнае існаванне мноства светаў і прамежкавых рэальнасцей. Асаблівую актуальнасць набывае паняцце віртуальнай рэальнасці. Віртуальная рэальнасць можа мець некалькі значэнняў. У філасофіі – гэта паняцце, з дапамогай якога абазначаная "сукупнасць аб'ектаў наступнага (у адносінах да рэальнасці, што іх спараджае) узроўню. Гэтыя аб'екты валодаюць аўтаномнасцю і анталагічна раўнапраўныя з той "канстантнай" рэальнасцю, ад якой яны паходзяць" [1, *122*]. У іншым (самым пашыраным) значэнні, віртуальная рэальнасць – гэта інтэрактыўнае асяроддзе, якое канструюецца з дапамогай камп'ютэрных сродкаў. Увогуле віртуальная рэальнасць – гэта любы нематэрыяльны свет. Свет мастацтва таксама з'яўляецца віртуальным. Віртуальная рэальнасць кампенсуе экзістэнцыяльную абмежаванасць рэальнага свету, дапамагае выйсці за межы часу, прасторы, нават смерці, "ануляваць сваю закінутасць і канечнасць, дасягнуць бяспекі і святасці" [Тамсама, *123*]. Такім чынам, віртуальная рэальнасць збліжаецца з міфалогіяй, задавальняе патрэбу чалавека ў кантакце з сакральным, выводзіць яго за межы звычайнага штодзённага жыцця.

**Літаратура**

1. Постмодернизм: Энциклопедия. Мн.: 2002. – 860 с.
2. Телегин С. Философия мифа. М.: 1994. – 2308с.
3. Элиаде М. Сон и смерть // Аспекты мифа. М.: 1999. – 386с.

## ВЫКАРЫСТАННЕ САМАТЫЧНЫХ ФРАЗЕАЛАГІЗМАЎ У МОВЕ БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ

*М. У. Юнаш*
Навуковы кіраўнік – к.філал.н., прафесар ***В. П. Красней***
*Беларускі дзяржаўны універсітэт*

Мова драмы – своеасаблівая разнавіднасць мовы мастацкай літаратуры. Яна характарызуецца багаццем выяўленчых сродкаў. Значнае месца сярод іх займаюць саматычныя фразеалагізмы.

Аўтары карыстаюцца рознымі спосабамі ўжывання гэтых устойлівых зваротаў. Адзін з такіх прыёмаў – ампліфікацыя. Паводле А.А. Анішчук, гэта "ўжыванне ў вузкім кантэксце пры блізкім ці кантактным распалажэнні сінанімічных фразеалагізмаў або фразеалагізма і слова"[1, 16]. Так, А. Макаёнак у п'есе "Зацюканы апостал", каб паказаць эмацыянальны стан персанажа,